У выніку выкарыстання гульні на ўроках і карэкцыйных занятках вучні мелі магчымасць замацаўваць веды аб паслядоўнасці пор года, вучыліся характарызаваць асаблівасці прыродных з'яў ў адпаведнасці з сезонам, фарміраваліся веды аб паводзінах жывёл і птушак у розныя поры года, аб ўзаемасувязі працы людзей і дзіцячых забаў ад сезонных змяненняў.

Дзеці замацоўвалі алгарытм апранання ў адпаведнасці з сезонам і надвор'ем. Фарміравалася ўменне называць прадметы адзення і абутку, арганізоўвалася работа па фарміраванні навыкаў глабальнага чытання – некаторыя малюнкі адзення падпісаны. Удзялялася ўвага замацаванню колераў.

У час апісання прыродных з'яў звярталася ўвага на паняцце "*умоўнае абазначэнне*".

Пры вывучэнні асаблівасцяў паводзін жывёл і птушак маецца магчымасць працаваць над засваеннем назваў.

У час работы над вывучэннем ўзаемасувязі працы людзей у розныя поры года маецца магчымасць садзейнічаць развіццю звязнага маўлення.

Пры выбары малюнкаў па вызначэнні дзіцячых забаў у розныя поры года праводзілася работа па фарміраванні правіл бяспечных паводзін у разнастайных гульнявых сітуацыях.

***Жадаем поспехаў!***



# *ВЯЛІКІ ТЭМАТЫЧНЫ АЛЬБОМ*

# "Поры года"

**Цімашчук Наталля Анатольеўна**
Месца работы : ***ДУА "Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І. Слабодчыкава"***
Пасада: ***настаўнік-дэфектолаг***
Стаж работы: ***30 гадоў***
Кваліфікацыйная катэгорыя: ***першая***

**Пратасевіч Галіна Пятроўна**
Месца работы : ***ДУА "Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І. Слабодчыкава"***
Пасада: ***настаўнік-дэфектолаг***
Стаж работы: ***8 гадоў***
Кваліфікацыйная катэгорыя: ***першая***

Гульня прызначана для дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектру старэйшага дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту

**Мэта:** фарміраванне і замацаванне ведаў аб паслядоўнасці пораў года, аб асаблівасцях прыродных з’яў, паводзін жывёл і птушак, працы людзей і дзіцячых забаў у розныя поры года.

**Задачы:**

фарміраваць уяўленне аб навакольным асяроддзі, узаемасувязі змены сезонаў з аб’ектамі жывой прыроды, працай людзей і дзіцячымі забавамі;

развіваць моўныя навыкі, садзейнічаць павелічэнню слоўнікавага запасу, памяці, слыхавога і зрокавага ўспрымання, славесна-лагічнага мыслення.

**Апісанне**

Дапаможнік складаецца з трох набораў дэманстрацыйнага матэрыялу:

1 набор – алгарытмы “Поры года”, якія адлюстроўваюць асаблівасці сезонных змяненняў у надвор’і, адзенні, працы людзей і дзіцячых забавах, у паводзінах жывёл і птушак,

2 набор – алгарытмы апранання па сезонах,

3 набор – гульнявое поле ў адпаведнасці з кожным сезонам.

Дапаможнік таксама ўключае 6 набораў раздатачнага матэрыялу.

**Інструкцыя па выкарыстанні:**

на наборным палатне кожнага сезона можна выкладваць характэрныя асаблівасці ў адпаведнасці з зададзенай інструкцыяй

**Мяркуемы вынік:**

засваенне ведаў аб характэрных асаблівасцях пор года (надвор’е, вопратка, занянткі людзей і дзіцячыя забавы, паводзіны жывёл і птушак)










